“Ніколі не думаў, што парафія можа так глыбока запасці ў сэрца святара”. Калядная гутарка з вяск

Аўтар: Арцём Ткачук
19.12.2021 00:00

Для значнай колькасці беларусаў вёска з’яўляецца крыніцай самых трапяткіх успамінаў. Святочны стол у гэтым “ландшафце” займае не апошнюю ролю. На жаль, святкаванні ў вясковых хатах малеюць, старэйшае пакаленне адыходзіць, а моладзь гуртуецца вакол гарадоў. Аднак ёсць дні, калі колькасць жыхароў вёсак павялічваецца ў разы. Напрыклад, калі “горад” едзе на каляду да сваіх. Пра гэта размаўляем з навадворскім пробашчам кс. Юрыем Кузьмічам. †

– Кс. Юрый, каго больш збіраецца на вялікія святы ў касцёле ў Новым Двары: мясцовых ці прыезджых?

– Гэта залежыць ад некаторых абставін. Да пандэміі было больш прыезджых. Канешне, збіралася шмат парафіян, але іх родных і блізкіх было прыкладна ў два разы больш. Пасля кавіда гэтая колькасць значна знізілася. Цяпер гасцей, магчыма, у паўтары разы больш. Аднак людзі ўсё роўна прыязджаюць, каб перажываць святы ў блізкім коле.

Але тут усё таксама зменліва – сёлета на Вялікдзень было менш людзей, чым у звычайную нядзелю. Пазней вернікі ўжо крыху прызвычаіліся да пандэміі, то на адпуст іх было болей, на св. Юрыя таксама.

Аўтар: Арцём Ткачук
19.12.2021 00:00